УДК 332.82 – 053.8(476)(091) «1991/2000»

# ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ УЛАДЫ БЕЛАРУСІ ПА ВЫРАШЭННІ ЖЫЛЛЁВАГА ПЫТАННЯ МОЛАДЗІ (1991–2000 гг.)

**Філазаповіч Таццяна Уладзіміраўна**
навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

Праблемы моладзі – гэта не толькі і не столькі праблемы самой моладзі, гэта праблемы грамадства, гэта агульнадзяржаўныя задачы. Праз іх вырашэнне грамадства выходзіць на якасна новы ўзровень развіцця. Праблема рэалізацыі права моладзі на жыллё была і застаецца адной з самых актуальных сацыяльных праблем.

Адным з важнейшых напрамкаў маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляўся рух па стварэнні маладзёжных жылых комплексаў (МЖК). У 1992 г. гэтая праца вялася практычна ва ўсіх буйных гарадах. Найбольшае распаўсюджанне рух МЖК атрымаў у Мінску, Гродна, Гомеле, Магілёве, Барысаве, Наваполацку, Віцебску, г.п. Барань Віцебскай вобласці. Будаўніцтва аб’ектаў МЖК ажыццяўлялася ў традыцыйным варыянце за кошт сродкаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у парадку долевога. Пры гэтым будаўніцтва аб’ектаў комплекса адбывалася пры непасрэдным працоўным удзеле будучых жыхароў МЖК [1, л. 133].

Пагаршэнне эканамічнага становішча ў Беларусі і краінах СНД паставіла на межы банкруцтва многія прадпрыемствы і зрабіла немагчымым далейшы ўдзел большасці дольшчыкаў у будаўніцтве аб’ектаў МЖК. Пад пагрозай спынення будаўніцтва аказаліся пачатыя аб’екты МЖК. Яны пачалі прасіць пазбавіць іх ад падатка на дабаўленную вартасць, які складаў 28%. У канцы 1992 г. МЖК былі ад яго пазбаўлены [1, л. 134].

Для будаўніцтва МЖК у рэспубліцы не было дастатковай колькасці крэдытных рэсурсаў. Адсутнічала Тыпавое палажэнне пра маладзёжныя жылыя комплексы.Яно было распрацавана пазней і зацверджана загадам Старшыні Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі № 221 ад 12 мая 1998 г. Палажэнне дазволіла ўніфіцыраваць падыходы да ўтварэння і арганізацыі дзейнасці МЖК.

Адной з важнейшых задач дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, зафіксаванай у Рэспубліканскай праграме «Моладзь Беларусі» з’яўлялася вырашэнне жыллёвай праблемы моладзі і паляпшэнне сацыяльных і бытавых умоў жыцця. Абавязковай умовай жыллёвай палітыкі з’яўляўся актыўны ўдзел у дадзеным працэсе не толькі дзяржавы, але і самой моладзі.

Вырашэнне пытанняў паляпшэння жыллёвых і сацыяльна-бытавых умоў жыцця маладых грамадзян было вызначана

нный архив библиотеки МГУ имени А.А. К

прыняццем указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 1996 г. № 358 «Аб мерах па паляпшэнні жыллёвых умоў моладзі», ад 18 кастрычніка 1996 г. № 428 «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў ва ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 1996 г. № 358», ад 7 ліпеня 1997 г. № 361 «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў ва ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 1996 г. № 358», ад 14 красавіка 2000 г. № 185 «Аб выдзяленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жыллёвых памяшканняў» [2, л. 25].

Падпісанне дадзеных указаў паслужыла штуршком да стварэння цэласнай сістэмы дзяржаўнай фінансавай падтрымкі маладых сем'яў, якія жадалі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы.

Указ № 358 прадуглежваў, што правам на атрыманне ільготных крэдытаў карысталіся маладыя грамадзяне ва ўзросце да 30 год (уключна) і маладыя сем'і, у якіх муж ці жонка не дасягнулі 31 года на момант апублікавання ўказа (11 верасня 1996 г.). Маладая сям'я станавілася на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па сталым  месцы жыхарства, а таксама па месцы працы кожнага яе члена. Спіскі маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў складаліся мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Дзейнасць указа № 358 таксама распаўсюджвалася на маладых грамадзян (халасцякоў і незамужніх), бяздзетных, разведзеных (аўдавелых мужа ці жонкі).

Будаўніцтва жылля маладымі грамадзянамі магло ажыццяўляцца як у форме МЖК, так і ў складзе жыллёва-будаўнічых кааператываў (ЖБК), або калектываў індывідуальных забудоўшчыкаў (КІЗ). Выкананне дадзенага ўказа увесь час знаходзілася на кантролі ў Дзяржкамітэце па справах моладзі і Камітэце дзяржаўнага кантролю.

Пры гэтым, правы на атрыманне ільготнага крэдыта мелі маладыя грамадзяне, сярэднямесячны супольны даход сям'і якіх не перавышаў памеру двух сярэднедушавых мінімальных спажывецкіх бюджэтаў на кожнага члена сям'і [3, л. 16].

Указам № 358 устанаўлівалася, што ў 1996–1997 гг. не менш 25% агульнай плошчы жылых памяшканняў, пабудаваных за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэта для прадастаўлення па дагаворах найму грамадзянам, якія маюць адпаведныя ільготы, выдзяляецца наступным катэгорыям маладых грамадзян, што знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў: інвалідам, сем'ям загінуўшых ці паўшых без вестки воінаў, воінам-інтэрнацыяналістам, асобам, якія пакутуюць цяжкімі формамі некаторых хранічных захворванняў, шматдзетным сем'ям, маючым траіх і больш дзяцей, адзінокім маці, удзельнікам ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС [4, л. 14].

Разам з выдзяленнем ільготных крэдытаў былі прадугледжаны і іншыя формы дзяржаўнай падтрымкі маладых сем'яў, якія знаходзіліся на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта выдзяленне аднаразовых бязвыплатных субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) і набыццё жылых памяшканняў, ільготныя крэдыты на набыццё хатняй маёмасці. Пражываючы асобна ад бацькоў альбо з непрацаздольнымі бацькамі, маладыя сем'і мелі патрэбу ў фінансавай падтрымцы. Выдаткі на добраўпарадкаванне кватэры часта з'яўляліся непасільнымі для працуючай моладзі. Разам з тым, стабільныя штомесячныя даходы давалі магчымасць пагашэння ільготнага крэдыту ў растэрміноўку. Максімальная сума такога крэдыту складала 200 мінімальных заработных плат. Пагашаўся крэдыт на працягу 3 гадоў, што з'яўлялася даступным для большасці маладых сем'яў.

У мэтах далейшай падтрымкі маладёжнага будаўніцтва была падрыхтавана і зацверджана пастановай Савета Міністраў ад 25 ліпеня 1997 г. № 962 Праграма першачарговых мер па развіцці маладзёжнага жыллёвага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь на 1997–2000 гг.

31 сакавіка 1998 г. быў падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 169 «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 1996 г. № 358», у якім прадугледжвалася працягненне крэдытнай лініі, адкрытай ААБ «Беларусбанк» для крэдытавання маладзёжнага жыллёвага будаўніцтва  да 2000 г.

Дзяржава аказвала фінансавую дапамогу у пагашэнні запазычанасці па ільготным крэдытам пры нараджэнні дзяцей. Маладая сям'я мела права на атрыманне фінансавай дапамогі дзяржавы ў выпадку нараджэння дзіцяці ў час ці пасля заканчэння будаўніцтва жылога памяшкання. За перыяд з моманту падпісання ўказа № 358 па 1 кастрычніка 1999 г. дадзеную фінансавую дапамогу дзяржавы атрымалі 844 маладыя сям'і на агульную суму 37 721, 5 млн. руб., у тым ліку ў 1998 г. – 150 сем'яў на агульную суму 5 497, 5 млн. руб., за студзень – верасень 1999 г. – 694 сям'і на агульную суму 32 224 млн. руб. У 1996 г. і 1997 г. фінансавая дапамога дзяржавы на гэтыя мэты не аказвалася [5, л. 4].

У Жылёвым Кодэксе Рэспублікі Беларусь, які набыў моц з 1 ліпеня 1999 г., для дзяцей сірат і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, пасля навучання ў вышэйшай, сярэдне-спецыяльнай, прафесіянальна-тэхнічнай навучальнай установе, па заканчэнні службы ва ўзброеных сілах, былі замацаваны правы на: пазачарговае атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання, калі за імі не захавалася жылое памяшканне; пазачарговае атрыманне ільготных крэдытаў, субсідый для будаўніцтва, рэканструкцыі ці набыцця жылога памяшкання [6, л. 4].

За час дзеяння ўказа № 358 (з верасня 1996 г. па снежань 1999 г.) у краіне была ўзведзена ў дзеянне 14 551 кватэра для маладых сем'яў агульнай плошчай 952 533,6 м², у тым ліку, за перыяд са студзеня па лістапад 1999 г. – 4879 кватэр агульнай плошчай 321 523 м². У 1998–1999 гг. вызначыўся прыкметны рост будаўніцтва жылля па Віцебскай, Гродненскай, Мінскай абласцях і па г. Мінску. Разам з тым, на 1 студзеня 1999 г. на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаялі 212 768 маладых сем'яў. Лічба больш чым ў 2 разы вышэйшая, чым у 1997 г. [7, л. 216].

Па стану на 1 студзеня 2000 г. на асобным уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Беларусі стаяла 213 614 маладых сем'яў [8, л. 50].

У той жа час, па рэспубліцы заданне па ўводу жылля не выконвалася ў сувязі з тым, што МЖК не з'яўляліся дзяржаўнымі структурамі, і з боку аблвыканкамаў праяўлялася пэўная незацікаўленнасць у аказанні ім своечасовай падтрымкі. У сувязі з адсутнасцю фінансавання многія МЖК спынілі сваю дзейнасць. Вялікая колькасць жылых аб'ектаў для маладых сем'яў на прыканцы 1999 г. былі яшчэ ў стадыі будаўніцтва. Складаная заставалася сітуацыя ў сельскай мясцовасці. Неабходна было ўдасканальваць і развіваць сістэму дзяржаўнай падтрымкі маладзёжнага жыллёвага будаўніцтва.

Аналіз па крэдытаванні жыллёвага будаўніцтва ў сельскай мясцовасці, праведзены «Белаграпрамбанкам», паказаў, што аблвыканкамы не выконвалі пастановы Савета Міністраў ад 28 красавіка 2000 г. № 608 у часцы накіравання сродкаў жыллёва-інвестыцыйнага фонду для заканчэння раней пачатага будаўніцтва жылых памяшканняў. У выніку было прыпынена крэдытаванне 1817 дамоў (кватэр), будаўніцтва якіх пачалося за кошт ільготных крэдытаў і не было завершана ў 1999 г. На іх будаўніцтва пайшло 1,25 млрд. руб. ільготных крэдытаў. Разам з тым, аблвыканкамы прапанавалі пачаць крэдытаванне 949 новых аб'ектаў з агульнай сумай сродкаў у памеры 1, 91 млрд. руб. [8, л. 36].

З прыняццем указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў» даступнасць ільготных крэдытаў для маладых сем'яў пагаршалася. Гэта звязана з тым, што вышэй адзначаным указам было прадугледжана выдзяленне ільготных крэдытаў па адзіным спіскам, складзеным с захаваннем чаргі грамадзян, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а ў Мінску атрыманне субсідый было абмежавана датамі пастаноўкі на чаргу: 1 студзеня 1986 г. (для субсідый), 1 студзеня 1990 г. (для крэдытаў). Раней для маладых сем'яў была прадугледжана асобная чарга на атрыманне ільготных крэдытаў і ўстаноўлены ліміт сродкаў на гэтыя мэты.

Праблема паляпшэння жыллёвых умоў моладзі была і застаецца адной з актуальных сацыяльных праблем моладзі. Вастрыня жылёвай праблемы была звязана з колькасным недахопам жылля, абмежаванасцю крэдытных рэсурсаў і няўзгодненасцю рынАчнага кошту жылля з узроўнем прыбыткаў большасці маладых людзей. Вырашэнню гэтай праблемы ў разглядаемы перыяд надавалася вялікая ўвага. Менавіта маладзёжная жыллёвая палітыка была вызначана Прэзідэнтам

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка прыярытэтным накірункам развіцця жыллёвага будаўніцтва ў краіне. Значным крокам у вырашэнні жыллёвай праблемы моладзі стала падпісанне ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 1996 г. № 358 «Аб мерах па паляпшэнні жыллёвых умоў моладзі». Прадугледжвалася магчымасць ільготнага крэдытавання маладых сем'яў, якія былі на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Разам з выдзяленнем ільготных крэдытаў былі прадугледжаны і іншыя формы дзяржаўнай падтрымкі маладых сем'яў. Гэта і аднаразовыя бязвыплатныя субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) і набыццё жылых памяшканняў, і ільготныя крэдыты на набыццё хатняй маёмасці, і аказанне фінансавай дапамогі дзяржавы ў пагашэнне запазычанасці па ільготным крэдытам. Аналіз вынікаў маладзёжнага жыллёвага будаўніцтва дазваляе зрабіць выснову, што былі зроблены значныя крокі ў вырашэнні маладзёжнай жыллёвай палітыкі, створана сістэма дзяржаўнай фінансавай падтрымкі маладых сем'яў, якія жадалі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. Аднак заставаліся актуальнымі задачамі ўдасканальванне і развіццё сістэмы дзяржаўнай падтрымкі маладзёжнага жыллёвага будаўніцтва.

ЛІТАРАТУРА


1. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 3.
2. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 118.
3. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 45.
4. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 30.
5. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 98.
6. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 62.
7. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 88.
8. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ, ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ, воп. 1, спр. 102.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку